# Критика и библиография

# Крытыка і бібліяграфія

# Review and Bibliography




## РЭЦЭНЗІЯ НА КНІГУ КІТУРКІ І. Ф. “ДЗЯРЖАЎНАЯ МЫТНАЯ СЛУЖБА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII СТ. (1764–1795)”

## РЕЦЕНЗИЯ НА КНИГУ КИТУРКО И. Ф. «ГОСУДАРСТВЕННАЯ ТАМОЖЕННАЯ СЛУЖБА ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XVIII В. (1764–1795)»

## REVIEW OF THE BOOK KITURKO I. F. “STATE CUSTOMS SERVICE OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE SECOND HALF OF THE 18th CENTURY (1764–1795)”

**Образец цитирования**:
Астрога, В. А. Рэцэнзія на кнігу Кітуркі І. Ф. “Дзяржаўная мытная служба Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVIII ст. (1764–1795 гг.)” / В. А. Астрога // Граница и пограничье. – 2023. – № 2 (4). – С. 79–83.

**For citation**:
Astroha, V. A. Review of the Book Kiturko I. F. “State Customs Service of the Grand Duchy of Lithuania in the Second Half of the 18th Century (1764–1795)”. Border and frontier. 2023. No. 2 (4). P. 79–83. Belarusian.

Гісторыя мытнай службы Беларусі, нягледзячы на яе агульную больш чым тысячагадовую гісторыю, усё ж застаецца адной з малавывучаных тэм беларускай мінуўшчыны. Напрыклад, на сёння з каля 50 мытняў, якія функцыянавалі ў розныя гістарычныя перыяды на беларускіх землях, дастаткова даследавана гісторыя толькі пяці устаноў: Гродзенскай рэгіянальнай, Брэсцкай, Магілёўскай, Мінскай рэгіянальнай і Гомельскай мытняў. Мае невялікія гістарычныя нарысы, але чакае свайго больш разгорнутага апісання дзейнасць Полацкай, Віцебскай, Ашмянскай, Мінскай цэнтральнай, Негарэлаўскай і іншых мытняў. Па нашых падліках, з 1991 г. беларуская гістарыяграфія мытнай справы складае звыш сотні публікацый і налічвае да дзясятка даследчыкаў. Але большая колькасць з гэтых прац – інфармацыйныя матэрыялы па сучаснай дзейнасці мытняў з невялікай гістарычнай часткай.

Трэба адзначыць, што фактычна навуковае даследаванне гісторыі мытнай справы Беларусі пачалося толькі ў 1990-х гг., пасля набыцця рэспублікай дзяржаўнай незалежнасці. Да гэтага часу беларускія сюжэты ў працах па гісторыі мытнай службы Расійскай імперыі ці СССР не асвятляліся. Адкладзеная патрэба ў вывучэнні і папулярызацыі гісторыі беларускай мытні здолела рэалізавацца толькі са стварэннем нацыянальнай мытнай службы ў 1991 г. Такім чынам, у 1990-х гг. беларускія гісторыкі сутыкнуліся з абсалютна новай для сябе спецыфічнай праблематыкай, якая патрабавала ад даследчыка некаторай эканамічнай альбо ўласна мытнай падрыхтоўкі. Гэта адразу абмежавала кола навукоўцаў, якія займаліся распрацоўкай мытнай тэматыкі.

Сапраўднай мяжой у развіцці нацыянальнай мытнай гістарыяграфіі стаў 2001 г., калі адзначалася 10-годдзе маладой мытнай службы Рэспублікі Беларусь. Да гэтага юбілею ў ведамасным часопісе “Мытны веснік” была размешчана невялікая публікацыя “З гісторыі мытнай службы Беларусі”, у якой ўпершыню выкладаўся афіцыйны погляд на мінулае беларускіх мытняў. Менавіта гэты год стаў тым “Рубіконам”, пасля пераходу якога беларуская гістарыяграфія мытнай справы паступова набірае абароты. Разам з невялікімі артыкуламі сталі з’яўляцца і манаграфіі.

Так, у 2003 г. значнай падзеяй у беларускай гістарыяграфіі стала манаграфія намесніка начальніка Гродзенскай рэгіянальнай мытні В. Ю. Саяпіна “Пяць стагоддзяў Гродзенскай мытнай службы” [1]. Гэта даследаванне стала першай навуковай працай, прысвечанай гісторыі асобнай мытні. У 2006 г. да 15-годдзя мытных органаў Беларусі пабачыла свет яшчэ адно багата ілюстраванае навукова-папулярнае выданне “Дзяржаўная мытная служба Рэспублікі Беларусь. Гісторыя і сучаснасць” [2], якое прадставіла поўную афіцыйную версію гісторыі мытнай службы. Кніга стала фінальнай кропкай перыяду фарміравання беларуска-цэнтрысцкай гістарыяграфіі мытнай справы. Гэтыя працы заклалі падмурак для далейшых навуковых пошукаў і адкрыццяў.

Выдадзеная ў 2023 г. манаграфія І. Ф. Кітуркі з’ўляецца чарговым каштоўным унёскам у веды па мытнай даўніне [3]. Але ведаючы спецыфіку мытна-гістарычных даследаванняў, можна казаць, што гэта і сапраўдная падзея ў беларускай гістарычнай навуцы. Тэма, якую абрала аўтар, адна з найменш вывучаных у айчыннай гісторыі. Даследчыца ўпершыню ў гістарыяграфіі ўсебакова і аргументавана прааналізавала эвалюцыю дзяржаўнай мытнай службы ў Вялікім Княстве Літоўскім (ВКЛ) у другой палове XVIII ст. Менавіта ў гэты час у беларускай гісторыі пачало стварацца паўнавартаснае мытнае ведамства. Таму манаграфія істотна паглыбляе нашыя веды па аднаму з самых дыскусійных і маладаследаваных перыядаў. Можна казаць, што нам адчыняецца terra incognita беларускай гісторыі.

Увогуле, на сёння перыяд ВКЛ недастаткова даследаваны як у агульным кантэксце беларускай гісторыі, так і ў тым, што датычыць вузкапрофільнай гісторыі мытнай справы. Першыя заўважальныя навуковыя публікацыі па гэтай праблематыцы з’явіліся толькі ў 2001 г. [4, 5]. Крыху пазней на праблему звярнуў увагу В. Ю. Саяпін. Агульная характарыстыка мытнай складаючай ВКЛ была прадстаўлена і ў выданні “Дзяржаўная мытная служба Рэспублікі Беларусь. Гісторыя і сучаснасць” [2].

Адзначым, што да сваёй манаграфіі І. Ф. Кітурка ішла дастаткова доўга і настойліва. У 2002 г. яна абараніла кандыдатскую дысертацыю “Сацыяльна-эканамічныя крызісы і палітыка гаспадарчага аднаўлення і развіцця ў дзяржаўных уладаннях Беларусі (другая палова XVII – XVIII ст.)” [6]. У 2014 г. цікавасць да эканамічнай гісторыі Беларусі прывяла яе да гісторыі беларускай мытнай справы таго ж перыяду. У хуткім часе ў беларускіх і замежных навуковых выданнях пачалі рэ-

гулярна з’яўляцца публікацыі, прысвечаныя самым разнастайным старонкам гісторыі мытнай службы ВКЛ другой паловы XVIII ст.

У 2023 г. сістэмная і руплівая навуковая праца І. Ф. Кітуркі знайшла адлюстраванне ў манаграфіі “Дзяржаўная мытная служба Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVIII ст. (1764–1795 гг.)”. Кніга напісана добрай літаратурнай беларускай мовай і, нягледзячы на шматлікую гістарычную прафесійную тэрміналогію, лёгка ўспрымаецца. Больш таго, аўтар у якасці дадатку падрыхтавала адмысловы слоўнік гістарычных тэрмінаў. Гэта дазваляе папулярызаваць веды аб гісторыі мытнай службы ВКЛ сярод не толькі спецыялістаў, але і шматлікіх аматараў гісторыі Беларусі.

Характэрнай рысай манаграфіі з’яўляецца шырокае выкарыстанне архіўных крыніц і старадрукаў, якія займаюць 156 пазіцый з 297 у бібліяграфічным спісе. Даследчыца руплiва працавала ў фондах Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы (Lietuvos valstybės istorijos archyvas), Літоўскага нацыянальнага музея (Lietuvos nacionalinis muziejus) і аддзела рукапісаў Бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта (Vilniaus universiteto bibliotekos Rankraščių skyriaus), вывучала старадрукі. Пераважная большасць гэтых дакументаў упершыню ўводзілася ў навуковы зварот. Яна была незнаёмая іншым даследчыкам, што пашырае ўяўленне пра крыніцы па беларускай мытнай гісторыі.

Структурна праца падзелена на шэсць раздзелаў. У *першым* раздзеле дэталёва разглядаюцца пытанні гістарыяграфіі і крыніц вывучаемай праблемы. Аўтар падрабязна аналізуе беларускую, польскую, украінскую, літоўскую і расійскую праблемную гістарыяграфію і справядліва прыходзіць да высновы аб адсутнасці глыбокіх даследаванняў аб мытнай службе ВКЛ разглядаемага перыяду. У *другім* раздзеле асвятляецца дзяржаўная палітыка па арганізацыі мытнай службы ВКЛ у другой палове XVIII ст. (перадумовы яе рэарганізацыі, роля Скарбовай камісіі ВКЛ у стварэнні дзяржаўнай мытнай службы, інстытуцыянальная структура мытнай службы). Аўтар схіляецца да высновы, што ў другой палове XVIII ст. дзяржаўная мытная служба ВКЛ станавілася арганічнай часткай выканаўчай улады, што дазволіла наладзіць эфектыўную працу па забеспячэнні мытнага кантролю і спагнання ў поўным памеры мытных пошлін і збораў. У *трэцім* раздзеле характарызуецца кадравае забеспячэнне дзейнасці дзяржаўнай мытнай службы: штатны расклад у каморах, сацыяльны статус і канфесійная прыналежнасць мытных служачых, службовыя абавязкі і нормы службовага этыкету мытнікаў, ступень іх адукаванасці, працоўны стаж і кар’ера. У выніку аўтар лічыць, што мытная служба ВКЛ у разглядаемы час уяўляла сабой складаную арганізацыйную структуру са строгай іерархіяй і субардынацыяй. *Чацвёрты* раздзел прысвечаны аналізу тэрытарыяльнага размяшчэння мытных пастоў, іх сістэме, рэарганізацыі і дзейнасці ў 1765–1795 гг. У падсумаванні даследчык пазначае, што ў гэты час дзяржаўныя інстытуты ВКЛ развіваліся і дзейнічалі, а мытная служба трансфармавалася з фіскальнай структуры ў інстытут, які адказваў за эканамічную бяспеку краіны. У *пятым* раздзеле раскрываецца роля мытнай службы ў ажыццяўленні дзяржаўнай эканамічнай палітыкі ВКЛ. У ім увага аўтара засяроджана на разглядзе мытных пошлін і тарыфаў, мытным кантролі, інфраструктуры мытнай каморы і паступленнях ад мытных збораў у ВКЛ у другой палове XVIII ст. У якасці высновы даследчык пазначае, што мытная служба ВКЛ была найбольш дасканала пабудаваным інстытутам у структуры тагачаснай выканаўчай улады. У *шостым* раздзеле даследуецца дзяржаўны кантроль за дзейнасцю мытных камор, найперш люстрацыі (1769, 1774, канца 1770-х і пачатку 1780-х гг.) і інспекцыя камор М. К. Агінскім у 1786 г. Пры аналізе працэдур люстрацыі мытных камор прыведзены шматлікія факты годнага нясення службы. У той жа час паказаны і факты нядбайнасці і карупцыі мытнікаў ВКЛ. Напрыклад, у кнізе аналізуецца справа аб карупцыі кіраўніка Юрбаргскай сплаўной мытні суперінтэнданта І. Кліковіча як адлюстраванне праблем у арганізацыі дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ. Аўтар прыходзіць да высновы, што, нягледзячы на існуючую ў пэўных памерах карупцыю, напрыканцы XVIII ст. адбываліся значныя змены ў арганізацыі дзейнасці структур дзяржаўнага кіравання ВКЛ (у тым ліку праз увядзенне сістэмы кантролю за працай дзяржаўных чыноўнікаў).

Манаграфія дэманструе вялікую і паспяховую пошуковую і аналітычную працу І. Ф. Кітуркі па розных кірунках дзейнасці рэфармаванага мытнага ведамства ВКЛ, ягоных камор. Напрыклад, маецца рознаябаковы храналагічны і лакальны падлік даходаў ад спагнання мыта ў мытных каморах ВКЛ. Гэта дазваляе ўбачыць эканамічны стан розных рэгіёнаў краіны, выявіць эфек-

тыўнасць мытнай службы. Безумоўна, актуальнай і карыснай часткай даследавання з'яўляецца і падрабязны аналіз метадаў і форм дзяржаўнага кантролю за дзейнасцю мытных камор, а таксама высновы па яго выніковай эфектыўнасці [3, с. 218]. Абсалютна справядліва аўтар надае ўвагу і пытанню кадравага забеспячэння мытнай службы ВКЛ. Па меркаванні даследчыка, кадры з'яўляліся важным фактарам, які ўплываў на станоўчае рэфармаванне заняпалай мытнай галіны краіны [3, с. 88].

Значны інтарэс уяўляюць і дадаткі, размешчаныя ў манаграфіі: 19 табліц, складзеных аўтарам паводле архіўных крыніц, 5 карт размяшчэння мытных пастоў і скарбовых правінцый ВКЛ, 30 малюнкаў з выявамі архіўных дакументаў 1760–1780-х гг. Сярод іх: бланк пашпарта, укладка кнігі мытных пратаколаў, выява пячаткі Талачынскай мытнай каморы, мытны квіток каморы, старонка з рапарта каморы, выявы вокладак мытных кніг і форменнага адзення. Дадаткі не толькі візуалізуюць мытную гісторыю, але і ажыўляюць яе, робяць рэальнай [3, с. 286–316]. Дадатак таксама змяшчае слоўнік спецыяльных гістарычных тэрмінаў і каталог-спіс вышэйшых пасадовых асобаў дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ (контр-рэгістранты і суперінтэнданты) другой паловы XVIII ст. (складзены на аснове архіўных крыніц) [3, с. 307–311]. Усе гэтыя матэрыялы з'яўляюцца каштоўнымі па свайму зместу і маюць як акадэмічнае, так і практычнае значэнне для мытнай справы Беларусі.

Напрыклад, вялікую цікавасць выклікае апісанне і фактычнае аднаўленне з небыцця выявы форменнага адзення мытных служачых ВКЛ (мал. 1). І. Ф. Кітурка разам з мастаком А. І. Бурчыкам упершыню ў айчыннай уніфармалогіі здзейснілі рэканструкцыю першага ўзору форменнага мытнага мундзіра. Гэтая рэканструкцыя ўяўляе не толькі навуковы інтарэс, але можа быць карыснай і для выхаваўчай працы ў мытных органах. Зялёныя і чырвоныя колеры мундзіра мытнікаў ВКЛ не толькі пашыраюць нашыя веды пра гісторыю форменнага мундзіра на беларускіх землях, але і маюць права ўзбагаціць і ўдасканаліць геральдыку сучаснай мытнай службы Рэспублікі Беларусь.



Мал. Форменнае адзенне мытнай службы Вялікага Княства Літоўскага (канец XVIII ст.). Суперінтэндант (злева) і стражнік (справа). Мастак А. І. Бурчык

Fig. Customs service uniform of the Grand Duchy of Lithuania (late 18th century). Superintendent (left) and guard (right). Artist A.I. Burchik

Безумоўна, праца І. Ф. Кітуркі будзе надзвычай патрэбна навукоўцам, выкладчыкам, студэнтам, аматарам гісторыі Беларусі і мытнай службы. Манаграфія з'яўляецца актуальным і патрэбным даследаваннем. Яе фактычны, аналітычны і ілюстратыўны матэрыял і высновы могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы абагульняючых прац па гісторыі Беларусі і гісторыі мытнай службы Беларусі, распрацоўцы беларускамоўнай мытнай тэрміналогіі, у адукацыйным працэсе (у курсе "Гісторыя мытнай справы Беларусі" для розных катэгорый навучэнцаў па спецыяльнасці "Мытная справа"). Несумненна, кніга прынясе карысць і самім мытнікам не толькі ў пашырэнні ведаў па прафесійнай гісторыі, але дзеля ўдасканальвання сваіх традыцый, праўядзення выхаваўчай, ідэалагічнай, музейнай, культурна-масавай працы. У выніку, гэта будзе ўзбагачэнне не толькі беларускай гістарычнай навукі, сістэмы адукацыі, мытнай службы, але і агульнай спадчыны Беларусі.

**В. А. АСТРОГА**[1]

## Бібліяграфічны спіс


1. Саяпин, В. Ю. *Пять веков Гродненской таможенной службы* / В. Ю. Саяпин. – Гродно : Гродн. тип., 2003. – 365 с.
2. *Государственная таможенная служба Республики Беларусь. История и современность* / под общ. ред. А. Ф. Шпилевского. – Минск : Белтаможиздат, 2006. – 248 с.
3. Кітурка, І. Ф. *Дзяржаўная мытная служба Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVIII стагоддзя (1764–1795 гады): манаграфія* / І. Ф. Кітурка ; Гродзен. дзярж. ун-т імя Янкі Купалы, Ін-т гіст. Нац. акад. навук. Беларусі. – Гродна : ГрДУ, 2023. – 359 с.
4. Шпилевская, И. Н. Из истории таможенной службы Минска / И. Н. Шпилевская // *Беларускі археаграфічны штогоднік*. – 2001. – Вып. 2. – С. 233–237.
5. Брэгер, Г. М. Выпадак на менскай мытні ў 1549 г. / Г. М. Брэгер // *Архіварыус*. – 2001. – Вып. 1. – С. 23–26.
6. Кітурка, І. Ф. *Сацыяльна-эканамічныя крызісы і палітыка гаспадарчага аднаўлення і развіцця ў дзяржаўных уладаннях Беларусі (другая палова XVII – XVIII ст.) : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук* : 07.00.02 / І. Ф. Кітурка ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2002. – 20 с.


## References


1. Sayapin, V. Y. *Pyat' vekov Grodnenskoj tamozhennoj sluzby* [Five centuries of Grodno Customs]. Grodno : Grodnenskaya tipografiya, 2003. 365 p. Russian.
2. Shpilevski, A. F., edit. *Grodnenskaya tamozhennaya sluzhba Respubliki Belarus': Istoriya i sovremennost'* [The State Customs of the Republic of Belarus. History and modern state]. Minsk : Beltamozhizdat, 2006. 248 p. Russian.
3. Kiturka, I. F. *Dzyarzaunaya mytnaya sluzhba sluzhba Vyalikaga Knyastva Litouskaga u drugoy palove XVIII st. (1764–1795 gady)* [State Customs Service of the Grand Duchy of Lithuania in the second half of the 18th century. (1764–1795)]. Grodno : Grodno State Univ., 2023. 359 p. Belarusian.
4. Shpilevskaya, I. N. Iz istorii tamozhennoj sluzhby Minska [From the history of Minsk Customs]. *Belarusian archaeographic yearbook*. 2001. No. 1. P. 233–237. Russian.
5. Breger, G. M. Vupadak na menskaj mytni u 1549 [Accident at Mensk Customs in 1549]. *Archivarius*. 2001. No. 1. P. 23–26. Belarusian.
6. Kiturka, I. F. *Sacyyalna-ecanamichnyya cryzisy i palityka gaspadarchaga adnaulennya i razvittya u dzyarzaunyh uladannyah Belarusi (drugaya palova XVII – XVIII st.): avtoreferat dissertatsii kandidata istoricheskih nauk* [Social and economic crises and state household recovering and development policy of the state ownerships of the Republic of Belarus] : abstract of the dissertation PhD (History). Minsk : Academy of sciences of Belarus, Institute for History. 2002. 20 p. Belarusian.


[1] Астрога Віктар Аляксандравіч – доктар гістарычных навук, прафесар; загадчык кафедры мытнай справы факультэта міжнародных адносін БДУ.

Острога Виктор Александрович – доктор исторических наук, профессор; заведующий кафедрой таможенного дела факультета международных отношений БГУ.

Astroha Viktar A., Doctor of science (history), full professor; Head at the Department of customs, Faculty of international relations of the BSU. ostroga.v@mail.ru

# ПРАВИЛА ОФОРМЛЕНИЯ ПУБЛИКАЦИЙ

# ПРАВІЛЫ АФАРМЛЕННЯ ПУБЛІКАЦЫЙ

# PUBLICATION RULES

■ К публикации в журнале принимаются статьи, содержащие оригинальные научные исследования (результаты исследования и выводы, ранее не опубликованные и не представленные в другие журналы) по проблемам отечественной и всемирной истории, истории международных отношений и внешней политики, по проблемам музееведения и регионоведения, связанным с формированием границ, историей таможенной и пограничной службы Беларуси (в исторической ретроспективе) и белорусского пограничья.

■ Статьи в журнале публикуются на белорусском, русском или английском языках.

■ В случае предоставления статьи по современной тематике (после 1991 г.) к статье автор(-ы) прилагает заключение экспертной комиссии в сфере государственных секретов государственного органа (организации).

■ При подготовке статей необходимо руководствоваться изложенными ниже правилами. Статьи, оформленные не по правилам, будут отклоняться.

■ Статьи предоставляются в электронной форме в виде документа Microsoft Office Word не ниже версии 2003 (иметь расширение *.doc или *.docx). Файл со статьей должен быть назван по фамилии автора, если авторов несколько – по фамилии первого автора. Текст статьи на бумажном носителе заверяется подписью автора(-ов).

■ Рисунки и таблицы необходимо вставлять в текст после соответствующих ссылок на них, а также продублировать отдельными файлами в формате .jpg/.cdr/.tiff/.eps/.xls или .psd (Adobe Photoshop) (без склеивания слоев). Рисунки должны быть четкими и качественными. Минимально допустимое разрешение – 300 dpi. Запрещается использовать рисунки, выполненные от руки, а затем отсканированные. Каждый рисунок должен иметь краткое название и ссылки в тексте (например, рис. 1). Все подписи к рисункам дублируются на английском языке по образцу:

Рис. 1. Участие Российской империи в войне 1809 г. Боевые действия российской армии в Галиции (3 июня – 14 октября 1809 г.). (Карта составлена по данным Российского государственного военно-исторического архива, Ф. 846. Оп. 16. Д. 3362, 3368–3374.)

Fig 1. Participation of the Russian Empire in the war of 1809. The fighting of the Russian army in Galicia (June 3 – October 14, 1809). (The map was compiled according to the data of the Russian State Military-Historical Archive, F. 846. Inven. 16. Case 3362, 3368–3374.)

Таблицы должны иметь заголовки, а рисунки – подрисуночные подписи. Таблицы и рисунки должны быть пронумерованы, размещаться после ссылок на них. Недопустимо повторение числовых данных одновременно в таблицах (графиках, диаграммах) и в тексте. К графикам (диаграммам) желательно отдельно прилагать представленные в табличном виде числовые данные, на основе которых они построены. Названия таблиц дублируются на английском языке.

Параметры набора текста: гарнитура – Times New Roman; кегль шрифта титульной страницы – 13 пунктов; кегль шрифта основного текста статьи и заголовка – 14 пунктов; межстрочный интервал – 1,5 строки; абзацный отступ – 1,25 мм, без переносов слов; поля со всех сторон – 20 мм.

Рекомендуемый объем оригинальной научной статьи, включая таблицы, рисунки и списки библиографических ссылок, – от 12 до 25 страниц (20 000–50 000 знаков), хроники научной жизни и рецензии – 5–6 страниц (до 10 000 знаков). Все страницы должны быть пронумерованы.

■ Структура статьи: титульная страница; УДК; название статьи; инициалы и фамилия автора (авторов); аффилиация; аннотация; ключевые слова; благодарность (при необходимости); полные сведения об авторе(-ах).

■ В статьях, публикуемых в разделах «Документы и публикации», «Научная жизнь», «Критика и библиография», «Персоналии», необходимо указывать название материала, а также сведения об авторе(-ах) (ФИО, степень, звание, должность, место работы, адрес организации, электронный адрес, контактный телефон автора) на русском, белорусском и английском языках.

■ Статья обязательно должна иметь следующие структурные части, которые выделяются в тексте полужирным шрифтом: введение; основную часть (результаты и их обсуждение); заключение; список библиографических ссылок (приводится на языке оригинала).

В список включаются только работы, процитированные в тексте статьи. Ссылки на библиографические источники даются в *порядке цитирования* (упоминания) – порядковый номер ссылки и цитируемые страницы (листы) в тексте пишутся в квадратных скобках (например: [1, л. 24], [2, с. 18; 3, л. 27–27 об.], [4–6]). Каждый источник должен иметь свой порядковый номер в списке.

Список библиографических ссылок должен быть оформлен в соответствии с ГОСТ 7.1-2003. Библиографическая запись. Библиографическое описание и согласно требованиям Инструкции о порядке оформления квалификационной научной работы (диссертации) на соискание ученых степеней кандидата и доктора наук, автореферата и публикаций по теме диссертации (утв. постановлением Высшей аттестационной комиссии Республики Беларусь 28 февраля 2014 г. № 3).

Примеры оформления

Монографии:

1. Шильдер, Н. К. *Император Александр Первый, его жизнь и царствование*: в 4 т. / Н. К. Шильдер. – Изд. 2-е. – СПб. : А. С. Суворин, 1904–1905. – Т. 2. – 1904. – 408 с.
2. Соколов, О. *Битва двух империй. 1805–1812* / О. Соколов. – М. : Астрель ; СПб. : Астрель-СПб., 2012. – 730, [4] с., 16 л. ил.
3. Pawłowski, B. *Wojna polsko-austriacka 1809 r.* / B. Pawłowski. – Warszawa : Volumen : Bellona, 1999. – 462 s.

Статьи из журналов, сборников и др.:

4. Валькович, А. Потерянный корпус. Войска князя Горчакова в 1812 году / А. Валькович // *Цейхгауз*. – 2002. – № 3. – С. 16–21.
5. Лукашевич, А. М. Ненадежный союзник: участие России в войне 1809 г. против Австрии / А. М. Лукашевич // *Журнал Белорусского государственного университета. История*. – 2021. – № 1. – С. 68–81. DOI: https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-1-68-81.

Архивные материалы:

6. Описание войны императора Александра против Австрии в 1809 году // *Российский государственный военно-исторический архив*. – Ф. 846. – Оп. 16. – Д. 3360. – Л. 3–104.
7. *Служба архивной деятельности войсковой части 2007* (САД в/ч 2007). – Ф. 1. Государственный пограничный комитет Республики Беларусь. – Оп. 5. – Д. 21. Переписка с пограничными органами Украины. Т. 1. – 23 декабря 1998 г. – 24 июня 1999 г. – 247 л.

References (на английском языке):

список всех библиографических ссылок необходимо представить на английском языке; количество источников, приведенных в списке библиографических ссылок и в References, должно совпадать;

в список литературы включаются сведения из англоязычных метаданных статьи (если они имеются), которые размещены одним блоком на титульной странице или в конце статьи: ФИО авторов на латинице; заглавие статьи на английском языке; название журнала на латинице (транслитерация, если нет информации об использовании журналом англоязычного названия); выходные данные (год, том, выпуск, номер, часть, номера страниц «от – до»); указание на язык